# Нетрадыцыйнае ў традыцыйным

Віктар ЗАЯЦ,
фота аўтара

**Сталічная мастацкая галерэя "Універсітэт культуры" прадставіла першую персанальную выстаўку графікі Надзі Букі "Нешта".**

Аўтарка нарадзілася ў Маладзечне, а першыя ўрокі малявання ёй даў бацька — графік Іван Смальякоў. Дзяўчына з дзяцінства брала ўдзел у разнастайных гарадскіх, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах. У 1996 годзе Надзя Бука заняла першае месца ў міжнародным конкурсе "Дзеці свету малююць Іерусалім". Гэта кампазіцыя і цяпер захоўваецца ў галоўным музеі Ізраіля. Праз год Надзя стала стыпендыятам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Вучылася ў Маладзечанскім музычным вучылішчы імя М. Кл. Агінскага на аддзяленні дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Там яна азнаёмілася з мастацтвам выцінанкі. І як вынік, яе дыпломнай работай стала серыя ілюстрацый у гэтай тэхніцы да кнігі ўласных вершаў. Потым былі выкладанне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў Красненскай школе Маладзечанскага раёна і вучоба на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Чатыры гады таму Надзя Бука ў другі раз стала стыпендыятам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі.

Падтэкст выстаўкі "Нешта" — нетрадыцыйнае ў традыцыйным. І гэта цалкам адпавядае работам як па сюжэтах, так і па тэхніцы выканання: традыцыйнае мастацтва выцінанкі Надзя Бука прадстаўляе нетрадыцыйнымі формамі. Яе сілуэты, выразаныя з паперы, існуюць у асобным свеце. Сюррэалістычныя вобразы і героі твораў апускаюцца на аркуш выдуманымі формамі і непадуладныя ніякай логіцы. Тонкім сімвалізмам і глыбокай філасофіяй дыхае кожная работа.

Усе кампазіцыі, выразаныя маленькімі нажніцамі з цэльнага аркуша паперы, уражваюць тонкасцю, далікатнасцю і дакладнасцю выканання. У іх гарманічна спалучаюцца такія віды мастацтва, як уласна выцінанка, калаж, сілуэт і аплікацыя. Непаўторны, арыгінальны стыль Н. Букі дазваляе кожнаму гледачу запоўніць сваім зместам фігуры ў кампазіцыях, далучыцца да яе фантастычнага свету. Свету, дзе мандарыны на снезе, цацачны мядзведзь гуляе чалавекам, а не наадварот, вожык займаецца медытацыяй на дне бутэлькі з тасолам, чацеры адмыслова звязаныя ў сусветным Сеціве, сімвалічная барацьба светлых і цёмных сіл… Адным словам, гэта — нешта!



***На здымку: Надзя Бука "Нядзіцячыя гульні".***

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ